Цана асобнага нумару 10 кап.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט אייך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
штодзённая газэта

ПАНЯДЗЕЛАК 13 САКАВІКА 1933 г.
№ 57 (3717)

ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ
Агавы рэдактар
Сэкцыі рэдактараў
Сэкратар . . 6-15
Начная рэдакцыя 12-65 (два званкі)
Выдавецтва . . . 2-44
АЎТАМАТЫ:
Адк. рэдактар . 20-831
Адк. сакратар . 22-161
Сэктары . . . 22-160
Кантора . . . 22-158

ТЭРМІН ПАДПІСКІ:
3 „ . . . 7 р. 20 к.
6 „ . . . 14 р. 40 к.
Падпіска прымаецца і выключна на пошце і дістаносцамі.
Рукапісы не звяртаюцца

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.
КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок помпаяй 1 руб. 50 коп.
КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
аб згубе 1 дакумэнту 2 руб.

Новая сетка унівэрмагаў па БССР

Распараджэньнем Наркамлегпрому Саюзу ССР у БССР арганізуецца сетка ўнівэрмагаў для абслугоўваньня рабочых і ІТР лёгкай прамысловасьці.

Пакуль адкрываюцца 8 магазынаў: у Менску—для абслугоўваньня скурзаводу «Бальшавік», швэйнай фабрыкі «Кастрычнік», абутковай фабрыкі, галянтарэйнай фабрыкі «Усход», шклозаводу «Пралетарый» і іншых прадпрыемстваў. У Гомелі—4 магазыны, якія будуць абслугоўваць скурзавод, абутковую фабрыку, швэйную і шорную фабрыкі. У Магілеве—3 магазіны для абслугоўваньня рабочых швэйнай, скуранай і шорнай фабрыкі. У Бабруйску—1 магазын для рабочых швэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага, у Касьцюкоўцы—1 магазын для шклозаводу. У Барысаве—1 магазын для абслугоўваньня шклозаводу імя Домбаля. У Рэчыцы—2 магазына для запалкавай фабрыкі «Х Кастрычнік» і заводу «Дубіцель». У Сьвіслачы—1 магазын для абслугоўваньня заводу «Кастрычнік».

Магазыны будуць знаходзіцца на поўным гаспадарчым разрахунку. Таварныя фонды на першы квартал імі ўжо вызначаны. Разьмеркаваньне тавараў будзе праводзіцца трыкутнікамі прадпрыемстваў, у залежнасьці ад ходу выкананьня свайго вытворчага пляну тым ці іншым цэхам.

Такім чынам, гэтыя магазыны будуць служыць магутнай зброяй у руках дырэктараў фабрык у мэтах падахвочваньня лепшых работнікаў ударнікаў і цэлых цэхаў, якія добра выконваюць свае вытворчыя пляны.

У Віцебску ўжо адкрыт адзін з такіх унівэрмагаў. (Белта).

ДЭПУТАТ, СЭКЦЫЯНЭР САВЕТУ—АКТЫЎНЫ БАЕЦ ЗА ТРЭЦЮЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ ВЯСНУ

З кожным днём усё скарачаюцца тэрміны, якія аддзяляюць нас ад пачатку вясеньніх палявых работ, з кожным днём усё набліжаецца наш «галоўны бой», бой за трэцюю бальшавіцкую вясну. Тым часам тэмпы разгортваньня работ па ўсім фронце пад гатоўкі да вясеньняй пасеўнай кампаніі ЎСЁ ЯШЧЭ АСТАЮЦЦА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫМІ. Зломлен і ўсё яшчэ ня выраўнен графік рамонту трактароў, што ставіць пад яўную пагрозу зрыву гатоўнасьць нашага трактарнага парку да вясны. Не закончана засыпка насеньня, і слаба ідзе ачыстка. Зусім недастатковы заботы аб кані, ад якога залежыць у агромнай меры посьпех сяўбы, асабліва тэрмін яе правядзеньня. Далёка не заканчана работа па арганізацыі і ўзмацненьню вытворчых брыгад у калгасах...

Апошні аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б, які ўзяў пад суровую бальшавіцкую крытыку буйнейшыя недахопы работы на вёсцы партыйных і савецкіх арганізацый Беларускі, пастанавіў «ЛІЧЫЦЬ ПЕРШАЧАРГОВАЙ ЗАДАЧАЙ УСЕЙ КП(б)Б РАШУЧАЕ ПАЛЯПШЭНЬНЕ КІРАЎНІЦТВА ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ І СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКАЙ НАОГУЛ».

Пленум напомніў аб папярэджаньні, зробленым ЦК УсеКП(б) бальшавікам Беларусі, што «такое адставаньне зьяўляецца простым вынікам адсутнасьці завостранай бальшавіцкай барацьбы партыйнай арганізацыі Беларусі з перараджэнцкімі антысавецкімі элемэнтамі, якія прыкрываюцца партбілетам, элемэнтамі, якія часта вядуць антысавецкую работу пад фальшыва-нацыянальным сьцягам».

Вясеньняя сяўба бягучага году для ўсёй КП(б)Б, для ўсіх савецкіх арганізацый Беларусі зьяўляецца буйнейшым палітычным экзаменам. Мы павінны напрэгчы ўсе сілы, націснуць на ўсе пэдалі, прывесьці ў рух усе ваганы, каб у рашучай барацьбе з перараджэнцамі, з кулацтвам, з усімі антысавецкімі элемэнтамі забясьпечыць перамогу і ў вясеньнім баі, вытрымаць гэты экзамен бліскуча.

З гэтага пункту гледжаньня вялізарнае значэньне набывае разгортваньне баявой бальшавіцкай работы сельскіх саветаў. Неабходна ўмацаваць сельсаветы, ачысьціць іх ад перараджэнцкіх і кулацкіх элемэнтаў, памагчы сельсаветам згуртаваць вакол сябе праверанымі савецкі актыў вёскі, наладзіць сыстэматычную штодзённую работу з ім, уцягнуць яго ў актыўную барацьбу за падрыхтоўку да вясеньняй сяўбы.

Уся палітыка-масавая і арганізацыйная работа сельсаветаў павінна праходзіць пад лёзунгам: ДЭПУТАТ, СЭКЦЫЯНЭР САВЕТУ, ВЯСКОВЫ АКТЫВІСТ — АКТЫЎНЫ БАЕЦ ЗА ВЫСОКА - ЯКАСНУЮ ТРЭЦЮЮ БАЛЬШАВІЦКУЮ СЯЎБУ..

Па ініцыятыве групы старшынь сельсаветаў Случчыны зараз У РАДЗЕ РАЁНАЎ БССР РАЗГОРТВАЕЦЦА СПАБОРНІЦТВА САВЕТАЎ НА ЛЕПШУЮ ПАДРЫХТОЎКУ І ПРАВЯДЗЕНЬНЕ ВЯСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ. Падняць высока гэты сьцяг спаборніцтва, уключыць у спаборніцтва кожны савет—наша задача. Пры гэтым мы павінны з асаблівай сілай падкрэсьліць наступнае: ТОЛЬКІ ТАДЫ СПАБОРНІЦТВА САВЕТАЎ БУДЗЕ ДЗЕЙСНЫМ, КАЛІ ЯНО АХОПІЦЬ ШЫРОКІЯ МАСЫ САВЕЦКАГА АКТЫВУ Ў ВЁСЦЫ, А НЕ ЗАМКНЕЦЦА Ў РАМКІ СЕЛЬСАВЕЦКІХ КАНЦЭЛЯРЫЙ; КАЛІ Ў ЯГО БУДЗЕ УЦЯГНУТ КОЖНЫ ДЭПУТАТ І СЭКЦЫЯНЭР САВЕТУ; КАЛІ ДАГАВОРЫ БУДУЦЬ ЗАКЛЮЧАЦЬ У САБЕ ЗУСІМ КАНКРЭТНЫЯ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ.

Даць кожнаму дэпутату, сэкцыянэру савету, актывісту зусім акрэсьленую, пэўную работу і сыстэматычна правяраць яе выкананьне—вось што патрэбна зараз зрабіць.

У першую чаргу неабходна сіламі дэпутацкіх груп, сэкцый і усяго савецкага актыву АРГАНІЗАВАЦЬ МАСАВУЮ ПРАВЕРКУ ЗАСЫПКІ, АЧЫСТКІ І ЗАХОЎВАНЬНЯ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ У САЎГАСАХ, КАЛГАСАХ І АДНААСОБНЫХ ГАСПАДАРКАХ. Ад кожнага дэпутата, сэкцыянэра, савецкага актывіста, які прымае ўдзел у гэтай праверцы, патрабуецца асаблівая пільнасьць. Нельга забываць, што на сяньне — гэта рашаючы ўчастак сяўбы, што шкодніцкая работа антысавецкіх элемэнтаў на гэтым участку асабліва небясьпечна. Быць бязьлітасным да клясавага ворага, выкрыць і разьбіць кожны манэўр кулака ці перараджэнца — вось абавязак удзельніка праверкі. ВЫНІКАМ ПРАВЕРКІ ПАВІННА БЫЦЬ ПРЫВЯДЗЕНЬНЕ ЎСЮДЫ Ў ПОЎНУЮ БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ ДА СЯЎБЫ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ.

Другім масавым мерапрыемствам, якое павінна быць праведзена такса ма сіламі дэпутацкіх груп, сельсавецкіх сэкцый і савецкага актыву, зьяўляецца ПРАВЕРКА ХОДУ РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ І СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАГА ІНВЭНТАРУ. Рамонтная кампанія — адзін з найбольш адсталых участкаў падрыхтоўкі да вясны. Выясьніць прычыны гэтага здаставаньня, ПАДЦЯГНУЦЬ РАМОНТ У КОЖНАЙ МТС, У КОЖНЫМ САЎГАСЕ І КАЛГАСЕ—вось што павінна даць масавая праверка.

Пад гэтым-жа пунктам гледжаньня павінна быць арганізавана ПРАВЕРКА ВЫКАНАНЬНЯ КОЖНАЙ ГАСПАДАРКАЙ ПАСТАНОВЫ ЦК і СНК СССР АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ КАНЯ ДА ВЯСНЫ, праверка складаньня і давядзеньня плянаў пасеўкампаніі да кожнай МТС, саўгасу, калгасу і адна асобнай гаспадаркі, праверкі ўстаноўленых севазваротаў і г. д. НЕ ГАСТРАЛЁРСТВА, НЕ ІНСПЭКТАРСКАЯ РЭВІЗІЯ ПАТРЭБНЫ НАМ, А ДЗЕЛАВАЯ, КАНКРЭТНАЯ ДАПАМОГА НА КОЖНЫМ УЧАСТКУ; НЯ ГОЛАЯ ПРАВЕРКА І ФАРМАЛЬНАЯ ФІКСАЦЫЯ НЕДАХОПАЎ, А БАЯВАЯ РАБОТА ПА ПАДЦЯГВАНЬНЮ АДСТАЛЫХ УЧАСТКАЎ ДА ЎЗРОЎНЮ ПЕРАДАВЫХ.

Возьмем, прыкладна, такую работу, як арганізацыя сталых брыгад ў калгасах. У чым павінна выразіцца тут роля сельсавету ці асобнага дэпутата савету?

Вядома, ня ў тым, каб прысьці, паглядзець і сказаць: «Ах, як у вас дрэнна, таварышы!». Ці наадварот: «А ў вас, таварышы, добра». Сельсавет, кожны яго дэпутат, якому даручана гэта работа, павінен ня проста канстатаваць факты, а дабівацца ўзорнай пастаноўкі справы арганізацыі брыгад у кожным калгасе, памагаючы саветам дзелавымі ўказаньнямі, змагаючыся з фармальным падыходам да гэтай работы, з няправільным ажыцьцяўленьнем яе.

Альбо возьмем такі участак, як АГРАМІНІМУМ. ВЫКАНАНЬНЕ АГРА - ТЭХНІЧНЫХ ПРАВІЛ ПЕРАСТАЛА ЎЖО БЫЦЬ ПРЫВАТНАЙ СПРАВАЮ КАЛГАСНІКАЎ ЦІ АДНААСОБНІКАЎ. Згодна пастановы III сэсіі ЦВК СССР, цяпер павінны быць устаноўлены абавязковыя для калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў агранамічныя правілы, за невыкананьне якіх віноўныя павінны прыцягвацца да адказнасьці. КАНТРАЛЯВАЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ГЭТЫХ АГРАПРАВІЛ, РАШУЧА ЗМАГАЦЦА СА СПРОБАМІ КУЛАЦКАГА САБАТАЖУ ІХ, ПРЫЦЯГВАЦЬ ВІНОЎНЫХ У ЗЛОСНА - ШКОДНІЦКАЙ РАБОЦЕ ДА АДКАЗНАСЬЦІ ПА ЗАКОНУ АБ АХОВЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЕМАСЬЦІ — ПАВІННЫ СЕЛЬСАВЕТЫ, ДЭПУТАТЫ І СЭКЦЫІ. Трэба з гэтай мэтай арганізаваць з савецкіх актывістаў, з дэпутацкіх груп ІНСПЭКЦЫІ ЯКАСЬЦІ, ПАСТЫ ЯКАСЬЦІ. Трэба правяць максымум апэрацыйнасьці, максымум ініцыятыўнасьці і энэргіі ў барацьбе за павышэньне ўраджайнасьці.

Выключна вялікая роля сельсаветаў і іх актыву ў барацьбе за арганізаванае правядзеньне сяўбы ў аднаасобным сэктары, які пакуль што мае ў сельскай гаспадарцы БССР вельмі вялікае значэньне.

Трэба праверыць, ці ўручаны кожнаму аднаасобнаму двару пляны па сяўбе, ці адпавядае наяўнасьць насеньня пасеўным заданьням, якія даны аднаасобнікам. Трэба ўсямерна ўзмацніць масава - растлумачальную і арганізацыйна-палітычную работу сярод беднякоў і серадняко-аднаасобнікаў. А да гаспадарак, якія злосна сабатуюць сяўбу, не забясьпечваюць сябе насеньнем, злачынна адносяцца да падрыхтоўкі каня, інвэнтару, да сяўбы, — павінны прымацца меры грамадзкага ўзьдзеяньня, а да асоба злосных — пазбаўленьня гэтых гаспадарак зямлі і прысядзібных участкаў і г. д.

Трэба ўстанавіць, што ЗА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ Ў АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ АДКАЗНАСЬЦЬ УСКЛАДАЕЦЦА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ НА СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І НА КОЖНАГА ЧЛЕНА СЕЛЬСАВЕТУ ЗА АДПАВЕДНЫ НАСЕЛЕНЫ ПУНКТ.

Трэба ставіць зараз работу сельскіх саветаў так, каб ператварыць іх ў апэрацыйныя штабы вясеньняй пасеўнай кампаніі. Так трэба ставіць работу з савецкім актывам, загартоўваць і выхоўваць яго ў агні няпрымірымай барацьбы з кулацтвам, антысавецкімі элемэнтамі, каб максымальна скарыстаць тэтую агромную палітычную сілу на дапамогу партыі і савецкай улады ў справе далейшага пад'ёму сельскай гаспадаркі, далейшага арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгаснага ладу на вёсцы.

Пры гэтым трэба цьвёрда помніць: ТОЛЬКІ ТОЙ ДЭПУТАТ САВЕТУ, ТОЛЬКІ ТОЙ СЭКЦЫЯНЭР, ТОЛЬКІ ТОЙ САВЕЦКІ АКТЫВІСТ АКАЦЦА НА ВЫШЫНІ СВАІХ ЗАДАЧ, АКАЖАЦЦА ЗДОЛЬНЫМ ВЫКАНАЦЬ РОЛЮ АРГАНІЗАТАРА, ХТО АСАБІСТЫМ ПРЫКЛАДАМ ГЕРАІЧНАЙ РАБОТЫ І БАРАЦЬБЫ ЗА ПОСЬПЕХ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ ЗА ПОСЬПЕХ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ БУДЗЕ ВЕСЬЦІ ЗА САБОЮ МАСЫ.

Сабраць гэты актыў, згуртаваць яго вакол партыйных і савецкіх арганізацый і рушыць яго ў авангардзе армії калгаснікаў у вясеньні бой—наш доўг, наш абавязак.

У гонар зьлёту—чырвоныя абозы са збожжам

КЛІМАВІЧЫ. (Па тэлефону ад наш. кар.). 10 сакавіка ў гонар раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў перадавыя калгаснікі арганізавалі чырвоныя абозы са збожжам.

Абозы прывезьлі на зьлёт 7 тон збожжа, для перадачы дзяржаўным вагатоўчым арганізацыям.

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). 10 сакавіка адкрыўся раённы зьезд калгаснікаў-ударнікаў Віцебшчыны. Перадавыя калгасы адзначаюць зьлёт ударнікаў арганізацыяй чырвоных абозаў са збожжам.

21-га сакавіка—усебеларускі зьезд калгаснікаў-ударнікаў

Забясьпечыць сваячасовую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы у кожным саўгасе, МТС, калгасе, у кожным аднаасобным двары—

баявая праграма спаборніцтва саветаў

Праверыць наяўнасьць і якасьць насеньня, стан трактарнага і конскага парку, фарсаваць зімнюю вывазку ўгнаеньня, распрацаваць і давесьці да кожнага калгасу правільныя севазвароты

Ударнікі Шклоўшчыны падхапілі ініцыятыву саветаў Случчыны і выклікаюць Чавускі раён

(Ад нашага райкоря)

ШКЛОЎ. 10 сакавіка скончыў сваю работу першы раённы зьлёт калгаснікаў-ударнікаў Шклоўшчыны. На зьлёце было 300 дэлегатаў. Зьлёт заслухаў даклад сакратара РК КП(б)Б тав. Кіштымава аб арганізацыі веснавой сяўбы і разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў саўгасах, МТС і калгасах.

У адказ на зварот Ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў, раённы зьлёт Шклоўшчыны самаабавязаўся ў бліжэйшыя дні поўнасьцю завяршыць падрыхтоўку да сяўбы з тым, каб закончыць сяўбу правых за 15 дзён. Ударнікі Шклоўшчыны паставілі перад сабой задачу аказаць дапамогу калгасам Харкаўскай вобласьці (УССР)—да 1-га красавіка сабраць і адгрузіць 800 тон насеннай бульбы.

З вялікім захапленьнем зьлёт ударнікаў заслухаў паведамленьне аб РАШЭНЬНІ РК КП(б)Б І ПРЭЗЫДЫУМУ РВК АБ УКЛЮЧЭНЬНІ РАЁНУ ВА ЎСЕБЕЛАРУСКАЕ СПАБОРНІЦТВА САВЕТАЎ на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. Падтрымліваючы ініцыятыву саветаў Случчыны, бюро РК і прэзыдыум РВК вынесьлі пастанову аб уключэньні ў спаборніцтва саветаў Шклоўшчыны. Адначасова з гэтым Шклоўшчына выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва Чавускі раён, муды накіроўваецца брыгада для заключэньня сацумовы.

Першым застрэльшчыкам па разгортваньню ўнутрыраённага спаборніцтва саветаў выступіў Старасельскі сельсавет, які заключыў сацумову з Александраўскім сельсаветам.

МЯДЗЬВЕДЗЕЎ.

З трыбуны зьлёту

Вечарам 11 сакавіка закончыў сваю работу раённы зьлёт калгаснікаў-ударнікаў Менскага раёну. Па дакладу тав. Чарнушэвіча зьлёт прыняў пастанову, у якой узяты самаабавязацельствы на лепшую падрыхтоўку і правядзеньне веснавой сяўбы. Зьлёт выклікаў на сацспаборніцтва Смаленскі раён Заходняй вобласьці.

*

Лепшыя ўдарнікі сацыялістычных палёў сабраліся на зьлёт калгаснікаў Меншчыны. З перадавых калгасаў прышлі яны расказаць, падзяліцца вопытам лепшай работы, лепшай арганізацыі працы ў калгасах, вопытам лепшай падрыхтаванасьці да бальшавіцкай вясны. Яны сабраліся ў чырвоную сталіцу БССР, каб выкрыць недахопы ў сваёй штодзённай рабоце і яшчэ з большым напружэньнем сіл і энэргіі, адданасьцю справе змагацца за бальшавіцкі калгас.

ЧЫСТЫ РЫГОР да калгасу, былу батраком. Батрачыў да рэвалюцыі ў папоў, памешчыкаў, у кулакоў. А што меў?—пытае сам сябе Рыгор. З 1930 г. Чысты Рыгор у калгасе. Лічыцца лепшым ударнікам. Некалькі разоў прэмяваўся. Выпрацаваў 323 працадні.

Тав. СТАЛІН у сваёй прамове на Ўсесаюзным зьезьдзе калгаснікаў-ударнікаў сказаў: «Наша бліжэйшая задача—зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі».

Адзін за другім паўплываюцца на трыбуне дэлегаты зьлёту і кожны пацьвярджае:

— Мы зробім калгасы бальшавіцкімі, мы будзем заможнымі.

Яны ведаюць, што зараз у калгасе зямля ёсьць, машыны ёсьць, інвэнтару, да сяўбы, — павінны прымацца меры грамадзкага ўзьдзеяньня, а да асоба злосных — пазбаўленьня гэтых гаспадарак зямлі і прысядзібных участкаў і г. д.

Трэба ўстанавіць, што ЗА ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ Ў АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ АДКАЗНАСЬЦЬ УСКЛАДАЕЦЦА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ НА СТАРШЫНЬ СЕЛЬСАВЕТАЎ І НА КОЖНАГА ЧЛЕНА СЕЛЬСАВЕТУ ЗА АДПАВЕДНЫ НАСЕЛЕНЫ ПУНКТ.

Трэба ставіць зараз работу сельскіх саветаў так, каб ператварыць іх ў апэрацыйныя штабы вясеньняй пасеўнай кампаніі. Так трэба ставіць работу з савецкім актывам, загартоўваць і выхоўваць яго ў агні няпрымірымай барацьбы з кулацтвам, антысавецкімі элемэнтамі, каб максымальна скарыстаць тэтую агромную палітычную сілу на дапамогу партыі і савецкай улады ў справе далейшага пад'ёму сельскай гаспадаркі, далейшага арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгаснага ладу на вёсцы.

Пры гэтым трэба цьвёрда помніць: ТОЛЬКІ ТОЙ ДЭПУТАТ САВЕТУ, ТОЛЬКІ ТОЙ СЭКЦЫЯНЭР, ТОЛЬКІ ТОЙ САВЕЦКІ АКТЫВІСТ АКАЦЦА НА ВЫШЫНІ СВАІХ ЗАДАЧ, АКАЖАЦЦА ЗДОЛЬНЫМ ВЫКАНАЦЬ РОЛЮ АРГАНІЗАТАРА, ХТО АСАБІСТЫМ ПРЫКЛАДАМ ГЕРАІЧНАЙ РАБОТЫ І БАРАЦЬБЫ ЗА ПОСЬПЕХ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ ЗА ПОСЬПЕХ ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ БУДЗЕ ВЕСЬЦІ ЗА САБОЮ МАСЫ.

Сабраць гэты актыў, згуртаваць яго вакол партыйных і савецкіх арганізацый і рушыць яго ў авангардзе армії калгаснікаў у вясеньні бой—наш доўг, наш абавязак.

Узброеныя заветамі правадыроў рабочай клясы...

(Гутарка з дэлегаткай Усесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў і Менскага раённага зьлёту калгаснікаў-ударнікаў т. КАСЬЦЯЛЕЦКАЙ

Скуднела крыху т. Касьцялецкая за апошні месяц. Цё-ж гэта жарты! Столькі ўражаньняў, столькі новага! Масква. Пігаты індустрыі. Зьезд Прамовы правадыроў. Т. Сталін. Выступленьні дэлегатаў. Дэлегаты з усіх куткоў неабсяжнага Савецкага Саюзу. Ды хіба-ж усё успомніш, усё перажажаш? Стомленасьць на твары тав. Касьцялецкай. Стомленасьць у кожнай марщчынцы сымпатычнага твару. Але шэрыя вочы гораць маладым агнём, гораць энэргіяй і жаданьнем барацьбы за заветы правадыроў рабочай клясы, за бальшавіцкую сяўбу.

Поўная энэргіі, зьявярнулася т. Касьцялецкая дамоў—да сябе ў камуну «Бальшавік», Караліцкага сельсавету. І хоць ногі падгіналіся ад стомленасьці, адразу-ж пабегла тав. Касьцялецкая да сакратара партячэйкі тав. Лясьніцкага. Коратка расказала яму аб асноўных задачах, пастаўленых зьездам.

— Галоўнае—падрыхтоўка да сяўбы. Каб насеньне было падрыхтавана, інвэнтар адрамантаваны, коні здаровыя, камуна—чыстая ад чужых элемэнтаў: Ухмыльнуўся сакратар. Кажа—будзем дзейсцвацаць».

— 5-га сакавіка давай пробны выезд у поле,—прапанавала тав. Касьцялецкая.

— Давай,—адказаў сакратар.

Увечары склікалі бюро ячэйкі. Пастанавілі — рыхтавацца да пробнага выезду.

На другі дзень т. Касьцялецкая першым чынам заглянула ў стайню. У вочы кінулася разварушанае сена. «На зьезьдзе казалі, каб бераглі кармы» падумала Касьцялецкая. І зрэшты ўмыла конюху, што раскідванае сена—гэта непарадак. Трэба падабраць. Трэба яго берагчы да веснавой сяўбы. Паглядзела коняй. У некаторых выгляд ня зусім добры. Нагляд недастатковы. Падумала—дзе прычына? Прычына—абязьлічка. Два конюхі даглядаюць 33 коні. Праўда, памагаюць ездавыя. Да кожнага ездавога прымацавана пара коняй. Яны сваіх коняй чысьцяць і поять. Але не заўсёды. Пра некаторых ездавых можна сказаць, што адносяцца да каня, як да бервяна. Падумала тав. Касьцялецкая—як зрабіць? Для пачатку парашыла—арганізаваць грамадзкі кантроль за правільным доглядам за канём. Дагаварылася з сяўтам камуны. Вылучылі трох актыўных камсамольцаў, з іх два—самі ездавыя. Далі ім наказ—самыя за парадкам, самі добры прыклад падаваўце. Склікалі зьлёт конюхаў. Выступіла тав. Касьцялецкая—доўга гаварыла аб значэньні каня ў гаспадарцы, аб тым, што сказаў пра каня тав. Сталін, што сказаў тав. Кагановіч, што сказаў тав. Будзёны, і што сказаў Наркамзем тав. Якаўлеў. Зразумелі конюхі—каня трэба берагчы.

Пайшла далей тав. Касьцялецкая на скотны двор. «Нешта зьмянілася»—падумала яна. Раней праходзіла—нічога гэтага ня бачыла. А цяпер шмат чаго заўважае. Вось адна карова брудная, другая таксама. Некаторыя вельмі худыя. Нічога дзіўнага, што мала малака даюць.—Кепска,—падумала зноў тав. Касьцялецкая,—і тут абязьлічка.

На скотным двары 80 дойных кароў. Даглядаюць іх 7 скотніц. Доіць

Тав. КАСЬЦЯЛЕЦКАЯ

5 даярак. Усяго 12 чалавек, а парадку няма. Чаму? Абязьлічка. Каровы не замацаваны. Няма адказных за пэўных кароў. У вынику—кропля малака, якая ледзь задавальняе членаў камуны.

Тав. Касьцялецкая зноў у савет. Патрабуе ліквідацыі абязьлічкі. Замацаваць кароў за людзьмі. Кожнай даярцы па 10 галоў. Няхай кормяць, чысьцяць, абмываюць і поюць. І няхай за іх адказваюць.

Ня хочуць даяркі новага парадку. Пратэстуюць. Работы больш. Так—прыбяжыць, раздва за вымя пацягнула, ёсьць малако—добра, няма—такса ма ня дрэнна—і пабегла. Не яна адказвае за кармёжку, за становішча каровы. Цяпер ня тое будзе. Адказнасьць за сваю справу, за свой участак—сур'ёзная справа. Ня хочуць гэтай адказнасьці даярки. Так спакайней...

— Нішто,—кажа т. Касьцялецкая,—згадзяцца. Мы іх угамаем... Зразумеюць, што карысьць ад гэтага яны-ж першыя атрымаюць.

Прывезла тав. Касьцялецкая бібліятэчку са зьезду. Пачала раздаваць каму аб доглядзе за сьвіньнямі, каму—аб доглядзе за канём, каму—аб паляводзтве... Потым схамянулася—так можна ўсю бібліятэчку раздаць, а потым і ня знойдзеш—каму раздала. Парашыла перадаць у хату чытальню: няхай усе карыстаюцца.

З першага-ж дня заняла Касьцялецкая сваё месца ў камуне—у парыковай брыгадзе. Саджаць радзіску і салат. Норма—1200 фляшчаў. Тав. Касьцялецкая садзіць па 1500. Норму перавыконвае. Падцягвае іншых.

Але не даюць спакойна працаваць. Часта адрываюць для дакладаў. Нікалі тав. Касьцялецкая дакладаў не рабіла. А тут—что ні вечар—даклад + даклады за кароткі час зрабіла тав. Касьцялецкая. І ўсюды адным дакладам не абмяжоўваецца.

У калгасе «Перамога» (в. Мацэвічы) пасьля дакладу разгарнуліся спрэчкі. Выявілася, што ў калгасе ёсьць чужыя элемэнты, у тым ліку сясра ксяндза, якая зьвіце супроць калгасу. Тав. Касьцялецкая расказала, як на Ўсесаюзным зьезьдзе выкрывалі падкопную работу кулакоў і іх агентуры, як трэба змагацца з клясавым ворагам. Калгаснікі рашылі: ачысьціць калгас ад чужых.

У Лошыцах на сходзе калгаснікаў выкрылі кулака Шашко, каваля, які схаваў шмат золата. Частку золата ён скаваў у гарнку, другую частку ў пустым снарадзе, і ўсё гэта замураваў у сьцяне сутарэньня. Зразумела, золата не давала яму пакою, ён чакаў з нецярпяньнем іншых перадкаў, другой улады і агітаваў аднаасобніка Вярбіцкага: «не запісвайся ў калгас, увесну будзе перамена». Калгаснікі спачатку не зразумелі, з кім яны маюць справу. Думалі—каваль, змаль «пралетарый». І калі паставілі на галасаваньне «пытаньне аб выключэньні—спачатку большасьць была супроць выключэньня Шашко з калгасу. Тады выступіла тав. Касьцялецкая. Яна сарвала маску з гэтага «пралетарыя», ускрыла яго душу, яго душу ён—і ўсе убачылі, што маюць справу з ворагам, з самым сапраўдным кулацкім ворагам, які хавае золата ў сутарэньні, спадзяючыся на зварот старых парадкаў, з кім падкопвае калгас зьнутры, каб старая ўлада—улада жандара, абшарніка, фабрыканта хутчэй зьявярнулася. Калгаснікі зразумелі, і калі ў другі раз паставілі пытаньне аб Шашко, сход пераважнай большасьцю галасоў пастанавіў выкінуць кулака Шашко з калгасу. Дэлегатка Ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў тав. Касьцялецкая выканала свой абавязак перад Савецкай краінай...

*

Усяго толькі тры тыдні прайшлі пасьля звароту Касьцялецкай з Ўсесаюзнага зьезду дамоў. Тры тыдні—гэта 21 дзень. І ня было дня, т. Касьцялецкая не праводзіла-б ці іншай работы, работы, асноўнай на рашэньнях Ўсесаюзнага зьезду работы, зьвязанай з рашэньнямі Ўсесаюзнага зьезду калгаснікаў-ударнікаў.

Так змагаюцца зараз лепшыя калгаснікі-ўдарнікі дэлегаты Ўсесаюзнага зьезду, узброеныя заветамі правадыроў рабочай клясы, за падрыхтоўку да сяўбы, за першую бальшавіцкую вясну другой пяцігодкі.

Р.

Аб правядзеньні 50-годзьдзя з дня сьмерці Карла Маркса

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б ад 11 сакавіка 1933 г.

50-годзьдзе з дня сьмерці Карла Маркса правесьці пад знакам мабілізацыі ўсёй КП(б)Б на павышэньне бальшавіцкай ваяўнічасьці і завостранасьці ў барацьбе за марксызм-ленінізм, за далейшае ўзбраеньне мас рэвалюцыйнай тэорыяй марксызму-ленінізму, за выкрыцьцё фальсыфікацыі марксызму з боку міжнародных сацыял-дэмакратыі, з боку II Інтэрнацыяналу, з боку контр-рэвалюцыйнага трацкізму, а таксама супроць усякіх скажэньняў марксызму-ленінізму з боку правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць «левага» апартунізму і ўсякіх іншых вылазак клясавага ворага на тэарэтычным фронце, якім-бы сьцягам ён не прыкрываўся. Уся работа па правядзеньні 50-годзьдзя з дня сьмерці Карла Маркса павінна быць разгорнута вакол гістарычных задач, пастаўленых апошнім пленумам ЦК УсеКП(б) і ў праграмных гістарычных выступленьнях т. Сталіна, а таксама вакол бальшавіцкіх пастаноў ЦК КП(б)Б за ленінскае правядзеньне нацыянальнай палітыкі партыі супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі і ўхілу ў бок мясцовага буржуазнага нацыяналізму, набываючага асаблівую надзённасьць зараз у нас, у БССР, за вялікія прынцыпы пралетарскага інтэрнацыяналізму, якія ляжаць у аснове вучэньня Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна.

Выходзячы з гэтага ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Правесьці з 10 сакавіка па 1 красавіка двухдэкадніК, прысьвечаны 50-годзьдзю з дня сьмерці Карла Маркса, мабілізуючы найпярэйшыя масы на яшчэ большае аўладаньне марксыцка-ленінскай тэорыяй, на барацьбу з усімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, на барацьбу за пасьпяховае далейшае пераможнае сацыялістычнае будаўніцтва, за выкананьне задач другой пяцігодкі.

2. З 14 па 20 сакавіка правесьці пасяджэньні пленумаў гаркомаў і райкомаў КП(б)Б, гарсаветаў сумесна з партыйнымі і прафсаюзнымі арганізацыямі, на якіх паставіць даклады, прысьвечаныя 50-годзьдзю з дня сьмерці Карла Маркса.

3. Правесьці 15-16 сакавіка 33 г. у Менску сход партыйных, савецкіх прафсаюзных, навуковых арганізацый прысьвечаны 50-годзьдзю з дня сьмерці К. Маркса. Даклад аб Карле Марксе даручыць т. Горыну. Арганізацыю сходу ўскласьці на Менскі гарком КП(б)Б.

4. Прапанаваць РК, ГК КП(б)Б правесьці адкрытыя сходы парт'ячэек аб 50-годзьдзі з дня сьмерці Карла Маркса, гутаркі на прадпрыемствах, у саўгасах, калгасах, МТС, выезды ў падшэфныя калгасы, увязваючы з задачамі правядзеньня веснавой сяўбы і вычышчэньня калгасаў ад клясава-варожых элемэнтаў, а таксама і па ўсёй сетцы партасьветы правесьці спэцыяльныя заняткі.

5. Прапанаваць ЦК ЛКСМБ заражжа разгарнуць па лініі камсамолу і цінэрарганізацыі растлумачальную работу аб 50-годзьдзі з дня сьмерці Карла Маркса.

6. Пр

Менск. Пэдінстытут патрабуе неадкладнага і рашучага аздараўленьня

За апошні час мы мелі на асобных участках фронту нашага сацыялістычнага будаўніцтва клясава-варожыя вылазкі і дзеяньні анты-савецкіх, эсэраўскіх, нацыянал-дэмакратычных і бундаўскіх элемэнтаў, якія часта выступалі пад фальшыва-нацыянальным сьцягам. ЦО нашай партыі «Правда» у артыкуле «Под фальшиво-национальным флагом» сьцігналізавала партыйнай і савецкай грамадзкасьці БССР аб актывізацыі контррэвалюцыйных нацыянал-дэмакратычных элемэнтаў у нашай рэспубліцы, якія вядуць антысавецкую, шкодніцкую работу, прыкрываючыся фальшыва-нацыянальным сьцягам. «Правда» у гэтым артыкуле сьцігналізавала таксама аб буйнейшых палітычных прарывах у рабоце Менскага Вышэйшага пэдагагічнага інстытуту:

Менскім Гаркомам партыі была вывучана спэцыяльная камісія для абсьледаваньня работы гэтага інстытуту. Вынікі абсьледаваньня сьведчаць аб тым, што ЦО «Правда» зусім правільна сьцігналізавала аб тых буйнейшых палітычных прарывах, якія маюць месца на такім адказнейшым участку фронту культурнай рэвалюцыі, якім зьяўляецца Вышэйшы Пэдінстытут.

Гэты інстытут рыхтуе кадры выкладчыкаў для тэхнікумаў і рабфакаў па грамадзкіх дысцыплінах: гісторыі, ленінізму, дыямату, палітэканоміі, тэорыі савецкай гаспадаркі, эканомгеаграфіі, літаратуры, пэдагогікі і пэдалёгіі. Матар'ялы камісіі гаркому партыі гаворыць аб тым, што падрыхтоўка высока-кваліфікаваных кадраў выкладчыкаў, якія па скончэньні пэдінстытуту павінны фармаваць ідэалёгію нашай моладзі, знаходзіцца ў пагражаючым становішчы. Пастаноўка выкладаньня, пастаноўка ўсёй выхаваўчай работы ў Вышэйшым Пэдінстытуце ня толькі не забясьпечвае падрыхтоўку высока-кваліфікаваных кадраў, узброеных тэорыяй Маркса-Леніна-Сталіна, падрыхтоўку марксысцка-вытрыманых кадраў выкладчыкаў грамадзкіх дысцыплін, а наадварот, на радзе важнейшых дысцыплін мы маем у Пэдінстытуце працягваньне клясава-варожай і чужой пралетарыяту ідэалёгіі. Гэта выклікаецца значнай засьмечанасьцю выкладчыцкага складу Пэдінстытуту клясава - варожымі нацдэмаўскімі, контррэвалюцыйна - трацкісцкімі і іншымі анты-савецкімі элемэнтамі, стаўшымі рабіць на катэдр і кіраўніцтвам іх работай.

За фактамі далёка не хадзіць.

Пачнем з катэдры гісторыі. Гэта катэдра яднае такія дысцыпліны, як гісторыя першабытнага грамадзтва, антычныя фармацыі і фэадалізм, гісторыя Захаду і гісторыя народаў СССР. Курс гісторыі дакапіталістычных фармацый вядзе праф. Перцаў: Гэты прафэсар, былы актыўны кадэт, чытае свой курс у духу эканамічнага вульгарнага матэрыялізму. У жасьці ж новых дапаможнікаў для ўсьвяленьня курсу гісторыі гэты вучоны муж дае студэнтам такія падручнікі, як Вып'эра, Кавалёва, Хвастова і свой улас ны падручнік, напісаны ім для гімназій у часе яго актыўнай работы ў каадэцкай партыі. Гэтыя падручнікі даюць па студэнтам бяз усякай крытыкі, і матар'ял, які прадпісваецца студэнцтву Перцавым, мала чым адрозьніваецца ад матар'ялу паказаных вышэй падручнікаў. Такім чынам, зразумела, што курс дакапіталістычных фармацый чытаецца ў яўна антымарксыцкім духу.

Курс па гісторыі Захаду да канца мінулага чытаўся прафэсарам Рыўлінам які па ўсяму курсу працягваў трацкісцкую кантрабанду. У сваёй лекцыі на тэму «Ленін у барацьбе з II Інтэрнацыяналам» Рыўлін у адкрытай форме паўтарыў тое, што ў свой час працягваў Слуцкі на старонках часопісу «Пролетарская революция». Ён на працягу ўсёй лекцыі даводзіў, што «II Інтэрнацыянал да 1905 г. адыгрываў рэвалюцыйную ролю, і ніякага апартунізму ў ім ня было». Вось што ён гаварыў: «З гэтай ацэнкі рэвалюцыйнай ролі, якую адыгрываў II інтэрнацыянал, мы павінны выходзіць і пры разгляданьні самой гісторыі інтэрнацыяналу і пры разгляданьні ленінскіх адносін да яго»,—бачыце, проста з арсэналу Слуцкага.

Больш таго, фальсыфікуючы Леніна, Рыўлін досыць катэгарычна заяўляе, што «Ленін ніколі не разглядаў II інтэрнацыянал, як апартуністычны». Рыўлін упарта даводзіў, што роль Леніна ў барацьбе з апартунізмам ёсьць яшчэ выключна расійская. Ён у сваёй лекцыі адмаўляў роль Леніна ў барацьбе з міжнародным апартунізмам. Падамо вытрымку з гэтай лекцыі: «Ленін з самага пачатку сваёй рэвалюцыйнай дзейнасьці вёў непрымірымую барацьбу з апартунізмам, э барацьба Леніна з апартунізмам ... заўсёды на расійскай грунце ... унутры РСДРП».

Няма патрэбы праводзіць тут увесь шэраг трацкісцкіх хлам, які быў вылі ... ны працыстам і студэнтам, у ВПІ. Прыведзенае больш чым дастаткова паказ ... тавар, гэтага прафэсара.

У лекцыях аб імпэрыялізьме гэты ... неразборчуўся трацкіст зусім ... скажаў ленінскую тэорыю імпэріялізму, абмяжоўваў трацкіст ... імпэрыялізму. У лекцыях аб ... сацыял-дэмакраты ён ... барацьбу Леніна з плынямі ў нашай с-д партыі. Па сутнасьці Рыў ... на працягу доўгага часу імкнуўся вывіць студэнцтву контррэвалюцыйны трацкісцкія ідэі.

У катэдры, якой кіраваў Рыўлін, ... пасвай гісторыкі Стальны і Марго ... (член КП(б)Б). Яны, будучы на ... х лекцыях Рыўліна і ведаючы, што ... з сабе ўяўляе, ня выкрылі яго контррэвалюцыйнай работы і па сутнасьці прыкрывалі яго:

Больш таго, дырэкцыя ВПІ, ведаючы стальнота, як прыкрывальніка працы ... яго кантрабанды Рыўліна, прызна ... яго загадчыкам катэдры замест ... нага. Гэта называецца «маркісцы ... ўмацаваньне катэдры. Пры раз ... на студэнцкай канфэрэнцыі трац ... ага хламу Рыўліна, Стальны да ... ў студэнтам залежнасьць барацьбы ... Леніна з меншавізмам і цэнтрызмам ... ад дакумэнтаў, якія могуць пад ... дзіць гэта. Калі-ж дакумэнта ... тады Стальны дазволіе сумня ... У праграме гісторыі Захада ... ным было дапушчана трацкісцкае ... ражаньне сялянскага пытаньня ... ны асобных сацыялістычных ... й і ў завуч'яным відзе трац ... тлумачэньне роли Леніна і яго барацьбы з апартунізмам II інтэрнацыяналу.

Курс гісторыі народаў СССР вёў студэнт беларускага кулацтва Гесэн; ён жа кіраваў і катэдрай гісторыі. Характэрна, што гэтаму апалёгету беларускага кулацтва органам Наркамасьветы і ЦП Працасьветы—часопісам «Камуністычнае выхаваньне»—быў прадастаўлены старонкі для яго трацкісцкай вылазкі. І гэтую яўную трацкісцкую вылазку Гесэна ні хто на прымецў ні ў Наркамасьветы, ні ў ЦП працасьветы. Твар гэтага вучонага яркі акрэсьлены; ясна і тое, якую ён атруту прышчаў студэнтам пэдінстытуту.

Да чаго прытупілася клясавая пільнасьць у інстытуце, відаць з таго, што дырэктар ВПІ тав. Воўкаў у недаўменьні і нават гатоў насьля выкрыцьця анты-савецкага твару Гесэна пакінуць яго на такой адказнай рабоце ў інстытуце. Як гэта ня дзіва, Воўкаў ашчэ дагэтуль не зразумеў, што клясаваму ворагу ня месца ў савецкай ВНУ.

На гэтай-жа катэдры працуе Чарняўскі, былы актыўны бундавец, які вёў два курсы—гісторыю народаў СССР і гісторыю яўрэйскага рабочага руху. Няма патрэбы доўга гаварыць аб ім. Між іншым скажам, што Чарняўскі ў сваіх работах імкнуўся даводзіць, што бунд да 1917 году быў рэвалюцыйным. Чарняўскі даходзіў да таго, што даказваў рэвалюцыйную ролю нават яўрэйскай буржуазіі. Гэты самы апалёгет яўрэйскай буржуазіі яўрэйскага кулацтва, гэты здраднік з партбілетам у кішэні скарыстоўваў катэдру ВПІ для працягваньня бундаўскіх ідэй—ідэй яўрэйскага нацыянал-дэмакратызму.

У сучасны момант катэдрай гісторыі народаў СССР кіруе прафэсар Віткоўскі (камуніст); ён вядзе курс гісторыі БССР, які чытаецца ім яўна неадпавядаючы з буйнейшымі скажэньнямі. У лекцыі аб рэвалюцыі 1905 г. у Беларусі Віткоўскі ня даў правільнага высьвятленьня рухаючых сіл рэвалюцыі і яе перарастаньня. Досыць указаць на такі факт: у якасьці сталых дапаможнікаў для прахаджэньня курса служаць падручнікі ўсім вядомых контррэвалюцыйных нацдэмаў Пчэты і Ігнатоўскага; асноўнымі падручнікамі па гісторыі выяўляюцца падручнікі Доўнар-Запольскага і Любаўскага. Усе гэтыя падручнікі даюцца студэнтам бяз усякай крытыкі і тлумачэньня. Наогул лекцыі Віткоўскага і дацэнта Якубчыка—гэта набор фактычнага матар'ялу без марксысцка-ленінскага аналізу. У выкладаньні курса гісторыі БССР ня толькі не забясьпечана правядзэнь не барацьбы на два фронты, не забясьпечана марксысцка-ленінскае разуменьне гісторыі нашай рэспублікі, а наадварот, такое праходжаньне курсу вяло да прывіваньня студэнцтву вялікадзяржаўных і нацдэмаўскіх установак у гісторыі БССР

Пераходзім да катэдры пэдалёгіі. На чале катэдры стаіць праф. Сарах цін. На гэтай катэдры пастараліся вызьніць навуковых працаўнікоў—камуністаў: Слямнаву, відаць за тое, што яна ў свой час на старонках газ. «Савецкая Беларусь» выступіла з крытыкай работы Сарахціна; былога рабочага,—выдаправодчыка — навуковага працаўніка тав. Бейліна ўвесь час трывіла катэдра,—ён таксама крытыкаваў кепскую работу Сарахціна. Урэшце тав. Бейлін быў абвешчан, як псыхічны на хворы.

Катэдра пэдалёгіі прадстаўляе сабой букет чуждых людзей. Вось у чыіх руках фактычна знаходзіцца гэта катэдра, і зусім зразумела, чаму катэдра пэдалёгіі распрацавала анкету, у якой студэнцтву прапанавалася вывучаць дзяцей выключна на бэй лёгічных фактарах. Цікава адзначыць, што ў адным з заданьняў студэнтам катэдры яўна прапагандавала кулацкія ідэі. Студэнцтву было дано для вывучэньня разьвіцьця дзяцей тэмы і словы: «деревня, река ,деньги». Вучань павінен па гэтых трох словах скласьці цэлы сказ, і тут студэнцтву ў якасьці прыкладу катэдрай быў пры ведзен такі сказ: —«Поедешь в деревню, обзаведешься хозяйством и деньги потекут к тебе рекой».

Сарахцін у праграме па пэдалёгіі, маючы на ўвазе буржуазную пэдалёгію, піша: «Унесістасвае дзяцінства—дзіця ўнегістарычных умоў, адсюль прырода дзіцяці патрабуе апалітычнага вы хаваньня». Ён заяўляў адарыта яшчэ наступнае, што «бытие не определяет сознание», і далей разважае,—ера зве может бытие—банка тухлых консервов—определять сознание».

Па сутнасьці работа катэдры пэдалёгіі была замкнута, калі так можна сказаць, сямейным замком. Студэнцкае вока ніколі не заглядала ў яе анты савецкую работу, катэдра абмяжоўвалася вузкім колам асоб, якія блізка стаялі да яе.

Пытаньне ясна. Няма патрэбы даводзіць тое, што такі склад катэдры пэдалёгіі і такая работа ні ў якім разе ня можа быць цярпіма ў нашай навучальнай установе.

Мала чым лепш стаіць справа і з катэдрай літаратуры. Прафэсар Піотухін пры ацэнцы станоўчых і адмоўных бакоў пралетарскіх пісьменьнікаў БССР, размалёўвае адмоўныя баки такім чынам, што ў студэнцтва складаецца думка, што ў БССР няма пралетарскіх пісьменьнікаў.

Курс рускай і заходня-эўрапейскай літаратуры чытаюць праф. Замоцін і Барычэўскі. У выкладаньні гэтага курсу не забясьпечана марксыцка-ленінскае асьвятленьне. Цікава адзначыць, што прафэсар Барычэўскі пры ўзьнікненьні спрэчных пытаньняў серод студэнтаў схіляецца на той бок, на якім стаіць большасьць. Бачыце, якая дэмакратыя. Больш таго, аснова ўсёй работы Барычэўскім зводзіцца выключна да перадачы біяграфіі, сюжэту і фабулы, сацыяльны-ж зьмест разьбіраемага твору амаль не асьвятляецца.

Не анэкдот, а сумны факт—студэнцтва літфаку ня ведае сутнасьці апошніх яў рэвалюцыйных, контррэвалюцыйных, нацыянал-дэмакратычных вылазак пад фальшыва - нацыянальным сьцягам (Сідарэнка-Пеначэўскі, С. Баранавых, Нікановіч і інш.).

Катэдрай мовазнаўства кіруе былы актыўны беларускі нацдэм Багдановіч, той самы Багдановіч, які працягваў нацдэмаўскія ўстаноўкі ў 1932 г. у праграмах для масавай школы. Ён імкнуўся гвалтоўна праводзіць беларусізацыю ў ВПІ. Калі студэнты яўсэкцыі здавалі яму залікі на ня зусім чыстай беларускай мове, мяпаючы не з рускай. Багдановіч заяўляе: «Я расійскую мову не разумею», і залік

Замаваны Галоўлітбел № А—234.

Упаўнаваж. Галоўлітбел № А—229.

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б па справе т. Сьцяпуры

1. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК КП(б)Б адзначаюць выключнае гістарычнае значэньне для ўсёй КП(б)Б пастановы ЦК УсеКП(б) ад 2 сакавіка 1933 г., якая са ўсёй бальшавіцкай прастатой выкрывае памылкі партыйных і савецкіх арганізацый Беларусі, дапушчаныя імі ў правядзеньні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Гэта зусім правільная і своячасовая пастанова ЦК УсеКП(б) павінна быць у першую чаргу ўлічана кіраўніцтвам ВССР (ЦК, СНК, ЦВК, ЦКК).

Памылкі партыйных і савецкіх арганізацый БССР, паказаныя ў пастанове ЦК УсеКП(б), сьведчаць аб тым, што імі ня была разгорнута бальшавіцкая барацьба за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, а ў радзе выпадкаў не даваўся адпор простаму патураньню буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям.

2. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК, разгледзеўшы пытаньне аб канкрэтных вінаватых, дапусьціўшых скажэньне нацыянальнай палітыкі партыі ў справе т. Сьцяпуры, указаным у «Правде», устанаўляюць, што непасрэднымі вінаватымі ганеньня на настаўніка т. Сьцяпура зьяўляюцца: прадстаўнік ЦВК—Вінаградаў, які ў той час знахо дзіўся ў раёне, заг. Крупскім райАНА —т. Чэпель і старшыня райкому саюзу працасьветы—т. Галаўнеў, якія вы карысталі факт напісаньня настаўнікам Сьцяпурай запіскі ў сельсавет на расійскай мове для арганізацыі на яго цкаваньня і тым самым паказалі, што яны зьяўляюцца яркімі выяўнікамі буржуазна-кулацкага нацыяналізму.

Бюро Крупскага РК, прэзыдыум РКК і прэзыдыум РВК, даведаўшыся ад Вінаградава аб фактах абвінавачаньня ім т. Сьцяпура ў т. зв. «махровым вялікадзяржаўным шавінізьме»,—вамест рашучага выкрыцьця бур жуазна-кулацкіх нацыяналістычных выхадак Вінаградава супроць т. Сьцяпура і прыняцьця неадкладных мер да іх выпраўленьня, —прадаставілі справу самацёку і тым самым дапусьцілі грубейшае скажэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі.

3. Бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК падкрэсьліваюць, што ўсё гэта магло мець месца таму, што крупская партыйная арганізацыя не зразумела, што на фоне перамогі нацыянальнай культуры у БССР—гэтыя факты зьяўляюцца выгоднымі толькі нашым клясавым ворагам, не разгарнула бальшавіцкай барацьбы за «палітыку зближэньня пралетараў і поўпралетараў розных нацыянальнасьцяй для суместнай рэвалюцыйнай барацьбы» (з праграмы УсеКП(б)) і не праводзіла пасьлядоўнай лініі партыі ў барацьбе з ухіламі ў нацпытаньні на два фронты і супроць вялікадзяржаўнага шавінізму як галоўнай небясьпекі і супроць мясцовага буржуазнага нацыяналізму.

Прыняць да ведама заяву тав. Ляўкова і сакратара РК—т. Штэйнгарта, што Крупскі РК КП(б)Б прыняўшы ў асноўным правільнае рашэньне па гэтым пытаньні, аднак, прыцягнуў вінаватых да адказнасьці толькі пасьля прыезду т. Ляўкова.

Выходзячы з указанага, бюро ЦК і прэзыдыум ЦКК пастанаўляюць:

1. Тав. ВІНАГРАДАВА з радоў партыі ВЫКЛЮЧЫЦЬ і ЗЬНЯЦЬ з працы.

2. Прыняць да ведама, што па прыезьдзе т. Ляўкова — ім разам з Крупскім РК былі зьняты з работы заг. крупскім райана — ЧЭПЕЛЬ, старшыня крупскага райкому саюзу працасьветы — ГАЛАЎНЕЎ. Апошні выключан з радоў ЛКСМБ. Сакратару Бабруйскай ячэйкі — ДРАГА вынесена СУРОВАЯ ВЫМОВА СА ЗЬНЯЦЬЦЕМ З РАБОТЫ.

Абвясьціць СУРОВУЮ ВЫМОВУ БЮРО КРУПСКАГА РК, ПРЭЗЫДЫУМУ РКК і прэзыдыуму РВК.

Аб рабоце Наркамасьветы БССР

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б

Абмеркаваўшы артыкул «Правды» ад 2-га сакавіка 1933 г. і «Зьвязды» ад 3 сакавіка 1933 г. па ачыстцы апарату Наркамасьветы ад клясава-варожых элемэнтаў і рад іншых матар'ялаў, бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што кіраўніцтва Наркамасьветы дапусьціла рад палітычных прарываў у рабоце органаў Наркамасьветы, як напрыклад:

а) дапушчэньне як работнікамі Наркамасьветы, так і яго органамі мэханічнага правядзеньня нацыянальнай палітыкі, адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму, а ў радзе выпадкаў простае патураньне буржуазна-кулацкім нацыяналістычным тэндэнцыям;

б) значная засьмечанасьць як апарату Наркамасьветы, так і яго органаў у цэнтры і на мясцох (ДВБ, ВНУ, тэхнікумы і інш.) клясава-чужымі, нацдэмаўскімі, бундаўска-сіяністкімі элемэнтамі;

в) зусім нездавальняючае правядзеньне дырэктыў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б па масавай і вышэйшай школе, вельмі дрэнная работа па палітэхнізацыі школы, а ў радзе выпадкаў зрыў палітэхнізацыі, скажэньне клясавай лініі ў праграмах і г. д.

Бюро ЦК падкрэсьлівае, што, ня гледзячы на канкрэтныя пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК, кіраўніцтва Наркамасьветы да сучаснага моманту не забясьпечыла карэннай перабудовы ў рабоце апарату Наркамасьветы, ачысткі яго ад клясава-чужых элемэнтаў, забясьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў у рабоце па кіраўніцтве нацкультурным будаўніцтвам. За гэта нясуць адказнасьць Наркамасьветы тав. ПЛАТУН, яго намесьнікі т. т. БЯЛУГА, ВАЛЬФСОН, РУДНІЦКІ, таксама ўсе члены калегіі Наркамасьветы ў цэлым.

Выходзячы з гэтага бюро ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абвясьціць т. ПЛАТУНУ вымову і вызваліць яго ад работы Наркамасьветы.

2. Абвясьціць вымову т. ВАЛЬФСОНУ і зьняць яго з работы ў Наркамасьветы.

3. Абвясьціць вымову т. т. БЯЛУГУ і РУДНІЦКАМУ, рашуча папярэдзіўшы іх, а таксама ўсіх членаў калегіі Наркамасьветы, што яны абавязаны сапраўды па-бальшавіцку разгарнуць барацьбу па ачыстцы апарату органаў Наркамасьветы ад клясава-чужых нацыяналістычных элемэнтаў і рашуча павярнуць работу па перабудове яе ў адпаведнасьці з дырэктывамі ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, ставячы ў галаву вугла сваёй работы барацьбу за асноўныя прынцыпы інтэрнацыяналізму ў нацыянальна-культурным будаўніцтве і супроць буржуазна-кулацкіх нацыяналістычных тэндэнцый.

4. Зьняць з работы дырэктара ДВБ тав. НЕКРАШЭВІЧА за дапушчэньне ім у рабоце ДВБ яўна буржуазна-кулацкіх нацыяналістычных тэндэнцый, вялікай засьмечанасьці нацдэмаўскімі элемэнтамі апарату ДВБ і за дапушчэньне выпуску Выдавецтвам яўна варожых выданьняў (артыкулы Сідарэнка ў часопісі «Беларусь калгасная» і інш.).

5. Даручыць т т. ЖАБРОЎСКАМУ, ЧАРНУШЭВІЧУ, ЛЯЎКОВУ ў бліжэйшыя 5 дзён перагледзець кіруючы склад Наркамасьветы і ДВБ і ўнесьці ў бюро прапановы аб умацаваньні апарату Наркамасьветы і Дзярж. Выдавецтва Беларусі моцнымі праверанымі работнікамі.

6. Даручыць усім ГК і РК КП(б)Б абмеркаваць на сваіх пасяджэньнях гэту пастанову ЦК КП(б)Б і зрабіць для сябе адпаведныя вывады ў сваёй практычнай рабоце на мясцох. а так сама прапрацаваць гэту пастанову на ячэйках.

Пастанова бюро ЦК КП(б)Б па справе т. Бабчонка

Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, што партыйныя і грамадзкія арганізацыі ВКСГШБ, разглядаючы справу т. БАБЧОНКА, зьвязаную з расказаным ім у часе лекцыі анэкдотам, які мяжуецца з антысэмітызмам,—у пачатку занялі ў гэтым пытаньні правільную лінію з тым, каб мабілізаваць грамадзкую думку на барацьбу з палітычна-шкодным анэкдотамі і на ўзмацненьне рэвалюцыйнай пільнасьці ў пытаньні правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі. Адначасова з гэтым, пры далейшым разборы гэтай справы грамадзкія арганізацыі ВКСГШ—сэкцыя навуковых работнікаў ВКСГШ і мясцком—дапусьцілі грубую палітычную памылку, якая выявілася ў неўгрунтаваным абвінавачаньні т. Бабчонка ў вялікадзяржаўным шавінізьме па тэй прычыне, што ён не аддаў свайго сына ў беларускую школу,—чым парушылі прынцып ленінскай нацыянальнай палітыкі.

ЦК канстатуе, што выступленьні асобных таварышоў (Бандарэнка, Краўчук) насілі яркa выражаны буржуазна - нацыяналістычны характар. Бюро парткому замест таго, каб разгаварыць на гэта і папярэдзіць дапушчаныя скажэньні фракцыяй МК і сэкцыяй навуковых работнікаў,—само дапусьціла грубую палітычную памылку, не паставіўшы гэтага пытаньня на правільныя партыйныя рэйкі, ня даўшы рашучага адпору буржуазна-нацыяналістычным элемэнтам, якія выявілася ў часе абгаварэньня справы т. Бабчонка ў ВКСГШ.

Выходзячы з гэтага, бюро ЦК КП(б)Б ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Прызнаць няправільнымі і скасаваць усе рашэньні грамадзкіх і партыйных арганізацый школы па справе т. Бабчонка.

2. Бюро парткому і фракцыі МК—за адсутнасьць рэвалюцыйнай пільнасьці ў галіне рашучай барацьбы з буржуазна-кулацкімі, нацыяналістычнымі тэндэнцыямі—АБВЯСЬЦІЦЬ ВЫМОВУ.

3. Фракцыі бюро сэкцыі навуковых работнікаў школы за грубае нецярпімае скажэньне ленінскай нацыянальнай палітыкі—абвясьціць СУРОВУЮ ВЫМОВУ і РАСПУСЬЦІЦЬ БЮРО СЭКЦЫІ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ ВКСГШ.

4. Кіраўніку катэдры мовы і літаратуры—т. БОНДАРЭНКА і старшыні бюро сэкцыі навуковых работнікаў—т. КРАЎЧУКУ, як натхніцелям усёй гэтай справы па абвінавачваньні тав. Бабчонка ў вялікадзяржаўным шавінізьме, абвясьціць СУРОВУЮ ВЫМОВУ.

5. Адначасова бюро ЦК адзначае, што т. Бабчонак, расказваючы анэкдот, які мяжуецца з антысэмітызмам, дапусьціў грубую палітычную памылку. Улічваючы прызнаньне ім сваёй памылкі, прапанаваць т. Аўчыньнікаву папярэдзіць т. Бабчонка аб недапушчэньні ў далейшым падобных зьявішч, з налажэньнем на яго адміністрацыйнага спагнаньня.

6. Прапанаваць т. Аўчыньнікаву, як дырэктару, адказваючаму за становішча партыйнай арганізацыі ВКСГШ і за выкладчыкаў, заняўшаму ў гэтым пытаньні правільную пазыцыю, разам з парткомам прыняць меры да недапушчэньня падобнага роду фактаў, для чаго правесьці работу па растлумачэньні сутнасьці гэтага пытаньня, мабілізаваць партыйную арганізацыю і грамадзкія арганізацыі школы на рашучую барацьбу ў нацпытаньні на два фронты—супроць вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, разам з тым асабліва завастрыць увагу за павышэньні рэвалюцыйнай пільнасьці і ленінскай непрымірымасьці ў справе рашучай барацьбы супроць усякіх замаскаваных спроб працягваньня мясцовага буржуазна-кулацкага нацыяналізму, супроць мэханічнага правядзеньня беларусізацыі, за няўхільнае правільнае ажыцьцяўленьне ленінскіх асноў нацыянальнай палітыкі, за ўзмацненьне прынцыпаў пралетарскага інтэрнацыяналізму.

ЗА ГРАНІЦАЙ

Вобыскі і арышты па ўсёй Германіі

Загад аб арышце камуністаў у Баварыі

БЭРЛІН. 11. Уноў прызначаны ўрадавы камісар Баварыі генэрал ЭППП, аддаў па тэлеграфу распараджэньне аб арышце ўсіх работнікаў кампартыі і кіраўнікоў рэйхсбанэра, а таксама аб правядзеньні ў іх вобыскаў. Сурова забаронена аказваць супрацьўленьне пры вывешваньні нацыянал-сацыялістскіх сьцягаў над афіцыйнымі будынкамі. Кожны пал'цэйскі пост павінен быць умацаван адным нацыянал-сацыялістскім штурмавіком. Штурмавікі атрымалі ад паліцыі ўзбраеньне.

На падставе распараджэньня ЭППА прадпрыняты вобыскі і арышты камуністычных рабочых у Баварыі. Арыштован таксама галоўны рэдактар «Зюддейчэ Зонтаго Пост».

Як паведамляе друк, камісар баварскага міністэрства ўнутраных спраў, кіраўнік баварскай нацыянал-сацыялістскай арганізацыі Вагнер, аддаў распараджэньне аб неадкладнай забароне і роспуску ў Баварыі «Саюзу рэспубліканскага сьцягу», які кіруецца с.-д.; так званага «жалезнага фронту» і саюзу сацыялістскай рабочай моладзі, з усімі іх дапаможнымі арганізацыямі. Нашэньне значкоў гэтых арганізацый забаронена. Маемасьць названых арганізацый павінна быць перадана паліцэйскаму кіраўніцтву да 20 сакавіка. Падтрыманьне забароненых арганізацый у любой форме будзе карацца турмой або штрафам.

Газэты, баварскай народнай партыі, якія выдаюцца ў Мюнхэне, «Бейрышэр Кур'ер» і «Дас Мюнхенер Нэйе Тагеблат» забаронены да 20 сакавіка.

Дзяржаўны камісар для асобных даручэньняў баварскі нацыянал-сацыяліст Эссэр, заявіў прадстаўніком друку, што нацыянал-сацыялістам дана дырэктыва паведаміць усім інстанцыям баварскай народнай партыі аб гатоўнасьці нацыянал-сацыялістаў неадкладна прыступіць да перагавораў аб стварэньні баварскага ўраду «на падставе канстытуцыі».

Далей Эссэр указаў, што ўзяты пад арышт усе работнікі кампартыі і рэйхсбанэру, якіх можна было выкрыць і апрача таго рад левых прамадзян, якія займалі кіруючыя пасады ў гаспадарчым і грамадзкім жыцьці.

Пазіцыю баварскай народнай партыі характарызуе артыкул яе партыйнага органа, у якім гаворыцца: «ня трэба крыўдзіцца на нацыянал-сацыялістскую партыю, калі яна хоча пакаць плады сваіх посьпехаў на выбарах у Баварыі».

Рэйхстаг склікаецца 21 сакавіка

БЭРЛІН. 11. Старшыня рэйхстагу Гэрынг публікуе заяву, што новы рэйхстаг склікаецца 21 сакавіка.

Зьверствы фашысцкіх катаў

ВЕНА. 11. Друк перапоўнен паведамленьням аб катаваньнях, якім падвергаюцца арыштаваныя камуністы ў германскіх фашысцкіх засьценках. Камуністычная «Ротэ Фанэ» паведамляе, што жыцьцё Торглера, які неадпаразова падпадаў катаваньням, у небясьпецы. Газэта заклікае рабочыя арганізацыі разгарнуць міжнародную кампанію для выратаваньня Торглера. Газэта паведамляе, што почву ў Лімбаху (Саксонія) быццам пры «спробе ўцячы» застрэлены трое арыштаваных камуністычных рабочых. У Хэмніцы (Саксонія) расстрэлен кіраўнік выдавецтва с.-д. газэты «Хэмніцэр Фолькстымэ». У Браўншвэйгу, а таксама ў Цшопаў застрэлены рабочыя пры заняцьці нацыянал-сацыялістамі сацыял дэмакратычнай газэты «Фольк фрэйнд».

Масавае ўцяканьне яўрэяў з Германіі

ЛЕНДАН. 11. (ТАСС). Польскае пасольства ў Бэрліне заявіла германскаму ўраду пратэст супроць гвалту нацыянал-сацыялістаў над польскімі яўрэямі ў Германіі. У пратэсьце ўказваецца, што калі гвалт ня спыніцца —у адказ будуць прыняты рэпрэсіі супроць германскіх грамадзян у Польшчы.

Варшаўскі карэспандэнт «Дэйлі гэральд» паведамляе, што на польска-германскай граніцы ў Верхняй Сілезіі можна наглядаць непрарыўны паток польскіх яўрэяў, ўцякаючых з Германіі ў Польшчу, каб выратавацца ад нацыянал-сацыялістскага тэрору. За адзін толькі дзень у раёне Бэйтана праз граніцу прайшло 240 яўрэяў.

Далей карэспандэнт паведамляе, што ў Бэрліне 70 гадовы рабін, польскі грамадзянін, быў жорстка зьбіты нацыянал-сацыялістамі ў форме, і што яго жыцьцё ў небясьпецы. Учора ў Бэрліне былі зьбіты нацыянал-сацыялістамі 4 другіх польскіх яўрэяў.

Як толькі нацыянал-сацыялісты заняцілі кантроль над саксонскім урадам, 15 польскіх яўрэяў, пражыўшых у Лейпцыгу, 12 год, атрымалі загад разам з сем'ямі неадкладна выехаць з Германіі.

Гэрынг прапануе Францыі дапамогу ў інтэрвэнцыі супроць СССР

ВЕНА. 11. Орган нацыянал-сацыялістцкай групы Отто Штрасэра «Дер Шварцэ Зендэр», які адкалоўся ад Гітлера, паведамляе аб гутарцы міністра ўнутраных спраў Гэрынга з французкім паслом у Германіі—Понсе.

«13 лютага—піша газэта—Гэрынг, які, як вядома, зьяўляецца прускім міністрам унутраных спраў, наведаў французкага пасла ў Бэрліне—Франсуа Понсэ і прапанаваў дапамогу Германіі з мэтай адарваць Украіну ад Савецкай Расіі, калі Францыя з свайго боку падтрымае Германію ў пытаньні «польскага карыдору». Гэтая прапанова—піша далей газэта—надзвычай характэрна для усяго жарандысцкага ўраду. Хочуць садрацца скуру са зьвера, не запэцкаўшы сабе рукі. Гэрынг жадае вызваліць германскі ўсход, але па матчымасьці без усякага рызыку для сябе. Калі падумаць, што такія зьнешна - палітычныя экскурсіі дазваляе сабе прускі міністар унутраных спраў, то лёгка сабе ўявіць, становішча ў габінэце.

Франсуа Понсэ, зразумела, неадкладна паведаміў усю гутарку з Гэрынгам рускаму пасольству. Што рускія не былі асабліва парадаваны такой зьнешне-палітычнай «работай» гітлераўскага ўраду—зразумела, і пазіцыя Літвінава на канфэрэнцыі па разбраеньні ў Жэнэве была адказам на гэту зьнешне-палітычную гусарскую выхадку Гэрынга. Гэрынг сваёй мядзьвежай нятрабнасьцю зноў разьбіў палітычны фарфор».

Фашысцкія банды за працай

ЛЕНДАН. 11. Бэрлінскі карэспандэнт «Таймс» адзначае, што фашысцкі гвалт ня спыняецца. Паступаюць паведамленьні аб асобах знойдзеных забітымі ў сабе на кватэры або ў іншых мясцох. Пры гэтым часта ўказваюць што гэта ахвяры взбойстваў зьяўляюцца рабочымі. Захопленыя камуністы расстрэльваюцца быццам пры спробе ўцячы. Адзельных ямы бясьследна зьнікаюць і нават паліцыя ня можа вынайсьці дзе яны. У часе налётаў безабаронныя людзі падпадаюць жорсткаму абыходжаньню. Выдатныя асобы, якія падазраюцца ў спачуваньні левым плынням знаходзяць мэтазгодным ня быць дома.

Адказны рэдактар—П. ШАСТАКОЎ.

Друкарня імя Сталіна.